«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Маці дзвюх дачок з Мазыра суд адправіў у калонію на два гады

08.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Ірына Гарашына. Фота з сацыяльных сетак.

У судзе Мазырскага раёна 8 лістапада разгледжаная крымінальная справа мясцовай жыхаркі Ірыны Гарашынай. Жанчына была абвінавачаная адразу па двух артыкулах крымінальнага кодэксу: арт. 342 (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх) і ч.2 арт. 203 (незаконныя дзеянні ў дачыненні да інфармацыі аб прыватным жыцці і персанальных дадзеных).

Справу разглядала суддзя **Валянціна Новікава.**

Першае судовае паседжанне прайшло яшчэ 26 кастрычніка.

Паводле хадайніцтва пацярпелага супрацоўніка міліцыі **Ропата** суд па Гарашынай зрабілі закрытым. Затым у судзе быў абвешчаны перапынак.

Пра крымінальны пераслед Гарашынай праваабаронцам пакуль вядома небагата.

Жанчыну арыштавалі 23 жніўня за тое, што яна пакідала допісы ў тэлеграм-канале «Мозырь 97», які быў прызнаным «экстрэмісцкім». А на першым судовым пасяджэнні абвінавацілі яшчэ ў «арганізацыі масавых беспарадкаў» (артыкул 342).

Прысуд вынесены жорсткі: **два гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму. Па другім артыкуле дадалі штраф у памеры 50 базавых велічынь.**

У Ірыны Гарашынай засталіся дома дзве дачкі – 7 і 15 гадоў.

Опубликовать







Мужа і жонку Каражан асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту

У рэгіёнах Міншчыны праводзяць пікеты ў "падтрымку выбараў". Разбіраемся, што з імі не так



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 20 лютага па 12 сакавіка

"Не мной правілы прыдуманыя, не мне іх парушаць". Як існуюць няпісаныя правілы камунікацыі ў месцах зняволення

"У мяне не было магчымасці супраціўляцца інакш". Маналогі затрыманых на антываенных акцыях два гады таму

"Турмы ў турме": захаванне правоў зняволеных ў ізалятарах, карцарах і ПКТ — праблемы і выклікі



ГАЛОЎНАЕ

"Гэта мусіла быць абмежаваннем волі, а не пазбаўленнем". Як палітвязні жывуць на "хіміі"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Фіялетавыя слёзы": у Міжнародны дзень правоў жанчын "Вясна" прэзентавала фільм

БЧБ-сцяг на акне, вымпел з "Пагоняй", выява з Раманам Бандарэнкам: за што беларусаў судзілі ў лютым

Сям'ю ў Гародні асудзілі за плакат, у якім нібыта змяшчалася абраза Лукашэнкі

Абнаўленні ў спісе "экстрэмісцкіх" матэрыялаў і чарговыя затрыманні: хроніка пераследу 12 сакавіка (дапоўнена)

Жыхара Гомеля асудзілі за "ўдзел ў экстрэмісцкім фармаванні" і данаты

"Больш за ўсё сумуеш у зняволенні па сваёй руціне", — былая палітзняволеная

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Люты 2024



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh



















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

